ПРАЛЕТАРЫІ УСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

ГОМЕЛЬСКІ УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, КАМІТЭТА ЛКСМБ
І ПРАФКОМАЎ ГОМЕЛЬСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА

№ 35 (557) | Субота, 3 снежня 1983 г. | Газета заснавана ў верасні 1969 года. Выходзіць раз у тыдзень | Цана 2 кап.

НА ПАРТЫЙНАЙ КАНФЕРЭНЦЫІ

Як паведамлялася ўжо ў нашай газеце, 19 лістапада адбылася XXIV партыйная канферэнцыя Цэнтральнага раёна г. Гомеля. Яна абмеркавала справаздачны даклад РК КПБ, выбрала кіруючыя органы, дэлегатаў на XXVIII гарадскую і XXII абласную партыйныя канферэнцыі.

На арганізацыйным пленуме РК КПБ яго першым сакратаром выбрана **Г. М. Кускова**, другім — **М. М. Караткевіч**, трэцім — **В. І. Чэпелаў**.

Членамі раённага камітэта партыі ад парт-арганізацыі нашага універсітэта выбраны сакратар парткома **М. І. Старавойтаў**, прарэктар па вучэбнай рабоце **Л. А. Шамяткоў**, кандыдатам у члены РК КПБ — студэнт гісторыка-філалагічнага факультэта **А. А. Горбач**.

Дэлегатамі ад партарганізацыі ГДУ на XXII абласную партканферэнцыю выбраны рэктар універсітэта **Б. В. Бокуць** і сакратар парткома **М. І. Старавойтаў**, на XXVIII гарадскую партканферэнцыю — рэктар **Б. В. Бокуць**, загадчык кафедры філасофіі **У. М. Калмыкоў**, прарэктар па навуковай рабоце **М. В. Навучыцель**, сакратар парткома **М. І. Старавойтаў**, дэкан фізічнага факультэта **У. М. Старыкаў**, прарэктар па вучэбнай рабоце **Л. А. Шамяткоў**.

ВЫСТАЎКА УНІВЕРСІТЭТАЎ

У лістападзе на ВДНГ СССР адкрылася выстаўка «Універсітэты — вядучыя вучэбна-метадычныя і навуковыя цэнтры краіны».

Больш ста тысяч выпускнікоў штогод заканчваюць універсітэты. Сёння гэта не толькі асноўныя вучэбныя цэнтры краіны. Усё больш увагі універсітэты ўдзяляюць навукова - практычнай дзейнасці. На выстаўку свае матэрыялы прадставілі 45 флагманаў вышэйшай адукацыі, што будзе садзейнічаць распаўсюджанню перадавога вопыту падрыхтоўкі спецыялістаў, далейшаму ўмацаванню сувязі навукі з вытворчасцю, павышэнню эфектыўнасці сумесных навуковых распрацовак.

На гэтай выстаўцы дэманструюцца прыборы і значны ілюстрацыйны матэрыял з нашага універсітэта.

ЗАСЛУХАНА НА САВЕЦЕ

Адбылося чарговае пасяджэнне Савета універсітэта.

В. а. дэкана матэматычнага факультэта М. В. Селькін, загадчык кафедры тэхнічных сродкаў апрацоўкі эканамічнай інфармацыі А. І. Іванюк, загадчык кафедры метралогіі У. М. Школдзін расказалі аб прымяненні мікрапрацэсарных сродкаў і мікра-ЭВМ у вучэбным працэсе і навуковых даследаваннях.

Аб ходзе выканання саюзных і рэспубліканскіх навукова-тэхнічных праграм і дадатковага задання Дзяржкамітэта СССР па навуцы і тэхніцы праблемнай лабараторыі праінфармавалі Савет В. Е. Быхаўцаў, Ф. М. Харытановіч, А. А. Малахаў, М. І. Ягоранкаў.

Па дакладу прарэктара па вучэбнай рабоце Л. А. Шамяткова зацверджаны «Патрабаванні» да прафесарска-выкладчыцкага саставу і супрацоўнікаў універсітэта з вышэйшай адукацыяй.

Выбраны на вакантныя і перавыбраны на займаемыя пасады прафесарска-выкладчыцкі састаў.

ЗА МІР НА ЎСЁЙ ПЛАНЕЦЕ

КАЛЕКТЫЎ ГОМЕЛЬСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА, ЯК І ЎСЕ САВЕЦКІЯ ЛЮДЗІ, ГОРАЧА АДАБРАЕ ЗАЯВУ ГЕНЕРАЛЬНАГА САКРАТАРА ЦК КПСС, СТАРШЫНІ ПРЭЗІДЫУМА ВЯРХОЎНАГА САВЕТА СССР ТАВАРЫША Ю. У. АНДРОПАВА

«Быць маладым — гэта вельмі адказна!» 26 гадоў таму назад гэтыя словы прагучалі на VI Сусветным фестывалі моладзі і студэнтаў. Асаблівы сэнс яны набылі цяпер, калі над чалавецтвам павісла пагроза тэрмаядзернай вайны. Значыць, роля моладзі ў барацьбе за мір, яго захаванне ўзрасла яшчэ больш.

У мінулую суботу на ўсіх факультэтах прайшлі масавыя мітынгі, на якіх студэнты і выкладчыкі аднадушна і горача адобрылі Заяву Генеральнага сакратара ЦК КПСС, Старшыні Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР таварыша Ю. У. Андропава, глыбока адлюстроўваючую знешнюю палітыку Камуністычнай партыі і Савецкага ўрада.

На мітынгу, які адбыўся на эканамічным факультэце, першым узяў слова выдатнік вучобы, старшыня вучэбна-выхаваўчай камісіі ГДУ, член камітэта камсамола Г. Ільюшчанка. Ён яшчэ раз напомніў асноўныя палажэнні Заявы таварыша Ю. А. Андропава:

— Як усе вы ведаеце, 24 лістапада гэтага года савецкае кіраўніцтва палічыла мэтазгодным давесці да ведама савецкіх людзей і сусветнай грамадскасці, даўшы ацэнку мілітарысцкага курсу цяперашняй амерыканскай адміністрацыі і прыняўшы свае рашэнні з выпадку размяшчэння каля граніц СССР і іншых дружалюбных нам краін ядзерных ракет сярэдняга радыуса дзеяння.

Агрэсіўная дзейнасць адміністрацыі Рэйгана і яе саюзнікаў па НАТО Савецкі Саюз і іншыя сацыялістычныя краіны ацэньваюць як злачынства супраць чалавецтва. У ЗША даўно аб'явілі «крыжовы паход» супраць сацыялізму і іменна на гэтай бяздумнай аснове будуецца практычная палітыка тых, хто размяшчае ракеты, тых, хто імкнецца да новай вайны.

Выступае студэнт В. Васін:

— Мы поўнасцю адабраем і падтрымліваем міралюбівую палітыку, праводзімую ўсім савецкім народам у асобе нашага ўрада. Амаль 40 гадоў краіны Заходняй Еўропы не ведаюць жахаў вайны. Велізарны ўклад у справу міру ўносіць Савецкі Саюз. Многае робяць усе міралюбівыя сілы. Аднак цяпер у свеце стала неспакойна. Можна з упэўненасцю сказаць, што агрэсія ў Ліване, Грэнадзе і размяшчэнне ракет у ФРГ, Англіі і Італіі ёсць прамая пагроза ў першую чаргу СССР, іншым краінам сацыялізму і ўсяму чалавецтву. У Заяве таварыша Ю. У. Андропава ўтрымліваецца напамін да кіраўнікоў ЗША і дзяржаў Заходняй Еўропы яшчэ раз узважыць вынікі, якімі пагражае бяздумная палітыка іх народам, усяму чалавецтву.

Адказныя меры СССР — гэта не пагроза міру, а яго абарона.

На мітынгу ўсхвалявана прагучалі і словы студэнткі Н. Аляксеенка, якая сказала:

— Цяпер, амаль праз чатыры дзесяцігоддзі, народы свету яшчэ адчуваюць цяжар мінулай вайны. А сучасныя сродкі яе вядзення не ідуць ні ў якае параўнанне з тымі, якія прымяняліся тады. Ядзерны канфлікт непазбежна прывядзе да катастрафічных вынікаў усёй цывілізацыі і самога жыцця на Зямлі. Вось чаму прамой небяспекай для справы міру з'явіліся планы ЗША і НАТО размясціць ядзерныя ракеты ў Заходняй Еўропе.

СССР — вялікая дзяржава, здольная абараніць сябе, адстаяць свае інтарэсы і інтарэсы сваіх саюзнікаў. Гэта яшчэ раз знайшло адлюстраванне ў Заяве таварыша Ю. У. Андропава.

— Размяшчэннем амерыканскіх ракет на тэрыторыі ФРГ, Англіі і Італіі, — гаварыла выступіўшая на мітынгу студэнтка эканомфака Т. Рэўко, — занепакоена ўсё прагрэсіўнае чалавецтва. Натуральна, што ў гэтых умовах савецкае кіраўніцтва вымушана было прыняць адказныя адпаведныя меры. Савецкі народ верыць, што яны будуць садзейнічаць прадухіленню ядзернай катастрофы, захаванню міру. Задача савецкага народа, наш абавязак у гэтых умовах — з'яднацца вакол Камуністычнай партыі і сваёй творчай працай мацаваць эканамічную і абаронную магутнасць Радзімы.

Шмат выступаючых было на мітынгах, якія прайшлі на геалагічным факультэце.

— Мы за мір! Але ва ўмовах стварэння ЗША палігона для крылатых ракет на тэрыторыі заходніх дзяржаў, — сказаў дацэнт В. Ф. Карташоў, — непасрэдна пагражаючым СССР і краінам сацыялістычнага лагеру, прыняцце своечасовых мер з'яўляецца крайняй неабходнасцю. Іменна таму мы аднадушна адабраем і падтрымліваем Заяву таварыша Ю. У. Андропава.

— Яшчэ не позна спыніцца, папярэдзіць ядзерную катастрофу, — сказаў трэцякурснік А. Тупіцкі. — Заява таварыша Ю. У. Андропава як раз і накіравана на гэта. Калі ЗША, краіны НАТО захочуць вярнуцца да зыходных пазіцый, то мы гатовы зрабіць гэта ў любы момант. Гэта самая гуманная прапанова. Мы нікому не пагражаем, і калі ў свеце наогул не застанецца ядзерных ракет, то гэта будзе асновай шчаслівай будучыні усёй планеты.

Мы лічым, што заява таварыша Ю. У. Андропава выражае думкі і імкненні ўсяго савецкага народа. Аднадушна адабраем і падтрымліваем яе.

Многія сотні студэнтаў і выкладчыкаў прынялі ўдзел у мітынгах па абмеркаванню і падтрымцы Заявы таварыша Ю. У. Андропава на матэматычным, фізічным, біялагічным і іншых факультэтах універсітэта. На іх выступілі прарэктар па вучэбнай рабоце член-карэспандэнт АН БССР Л. А. Шамяткоў, сакратары партыйных бюро Л. Я. Палякоў, Т. П. Жалонкіна, В. А. Хількевіч, дацэнты І. М. Бруй, У. І. Міроненка, А. М. Сердзюкоў, Э. М. Энцін, В. А. Лазбень, многія іншыя выкладчыкі і студэнты.

У той жа дзень, 26 лістапада, выкладчыкі і студэнты ГДУ прынялі ўдзел у гарадской маніфестацыі, прысвечанай 40-годдзю вызвалення Гомеля ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Многія маніфестанты неслі лозунгі са словамі недапушчэння размяшчэння ў Заходняй Еўропе амерыканскіх ядзерных ракет, з заклікамі да раззбраення і міру, забароны зброі масавага знішчэння.

«ДНІ НАВУКІ» НА ПРАДПРЫЕМСТВЕ

У рамках комплекснага дагавора аб доўгатэрміновым сацыялістычным супрацоўніцтве паміж кафедрай палітэканоміі ГДУ і вытворчым аб'яднаннем «Гомельканд ытарпрам», заключаным у мінулым годзе на бягучую пяцігодку, 21 і 28 лістапада на прадпрыемстве прайшлі «Дні навукі». Выкладчыкаў кафедры прымалі рабочыя і служачыя вытворчых падраздзяленняў фабрыкі «Спартак».

Вучоныя расказалі аб асноўных напрамках павышэння эфектыўнасці грамадскай вытворчасці, аб шляхах спалучэння дасягненняў навукова-тэхнічнага прагрэсу з перавагамі сацыялістычнай сістэмы гаспадарання з мэтай павышэння прадукцыйнасці працы, аб метадах прагназіравання і планіравання навукова-тэхнічнага прагрэсу. Па гэтых праблемах перад працоўнымі выступілі дацэнты Г. А. Ветлугаеў, М. В. Герасімчык, У. С. Дайнека, Т. А. Мальгіна. Вялікую цікавасць у слухачоў выклікалі таксама выступленні дацэнтаў У. Ф. Бондарава і В. П. Галеева, якія прааналізавалі ход выканання Харчовай праграмы.

Пасля выступленняў вучоных адбылося абмеркаванне пытанняў аб ролі працоўных калектываў у паскарэнні ўкаранення дасягненняў навукова-тэхнічнага прагрэсу ў вытворчасці, аб умацаванні працоўнай дысцыпліны, павышэнні эфектыўнасці вытворчасці і інш.

А. КАНАШЭВІЧ,
выкладчык кафедры палітэканоміі, кандыдат эканамічных навук;

М. МАЛАХАВА,
старшы інжынер-тэхнолаг, нам. сакратара партбюро вытворчага аб'яднання «Гомельканд ытарпрам».

ЛЕКЦЫІ ВЯДУЧАГА СПЕЦЫЯЛІСТА

У апошнія гады сталі рэгулярнымі запрашэнні вядучых вучоных сталічных ВНУ і акадэмічных інстытутаў у іншыя ВНУ краіны. Усё часцей прыязджаюць вядомыя спецыялісты і ў наш універсітэт. Так, з 14 па 19 лістапада на кафедры палітэканоміі працаваў загадчык кафедры палітэканоміі Інстытута павышэння кваліфікацыі выкладчыкаў грамадскіх навук пры Белдзяржуніверсітэце імя У. І. Леніна доктар эканамічных навук, прафесар І. Д. Прахарэнка. За час знаходжання ў Гомелі ён аказаў вялікую дапамогу выкладчыкам нашай кафедры ва ўдасканальванні вучэбна-метадычнай і навуковай работы. І. Д. Прахарэнка даў каштоўныя парады па далейшаму паляпшэнню выкладання палітэканоміі і высокакваліфікаваныя кансультацыі саіскальнікам кафедры па падрыхтоўцы кандыдацкіх і доктарскіх дысертацый. Надоўга запамятаюць студэнты другога курса эканамічнага і чацвёртага курса фізічнага факультэтаў выдатна прачытаны ім актуальны і цікавы спецкурс па пытаннях удасканальвання вытворчых адносін развітога сацыялізму. З яркім і змястоўным дакладам выступіў наш госць на пашыраным метадалагічным семінары перад выкладчыкамі-палітэканомамі ВНУ горада.

Мы спадзяемся, што такія карысныя прыезды вядучых спецыялістаў у наш універсітэт у далейшым стануць значна часцейшымі.

У. БОНДАРАЎ,
загадчык кафедры палітэканоміі, дацэнт.

НАБЫВАЮЦЬ ГРАМАДСКІЯ ПРАФЕСІІ

Ідзе новы навучальны год на факультэце грамадскіх прафесій універсітэта. У школе маладога лектара, на аддзяленнях метадыстаў-арганізатараў камсамольскай работы, грамадскіх сацыёлагаў, журналістыкі, атрадных важатых, інструктараў-метадыстаў па ахове прыроды, турызму, экскурсаводаў, арганізатараў спартыўна-масавай і культурна-масавай работы займаецца нюжны чацвёрты студэнт ГДУ.

Больш 100 чалавек вырашыла набываць веды па журналістыцы. На першых занятках гэтага аддзялення па ўводнай тэме: «Журналістыка як вобласць грамадска-палітычнай дзейнасці» выступіў член бюро абласной журналісцкай арганізацыі, аўтар чатырох кніг карэспандэнт «Сельской газеты» па Гомельскай вобласці М. Ермакоў.

Урачыста адзначана знамянальная дата — 40-годдзе з дня вызвалення г. Гомеля ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў у нашым універсітэце. Тут працуюць, выхоўваюць моладзь патрыётамі сваёй Радзімы ветэраны Вялікай Айчыннай вайны, тыя, хто ў далёкім 43-м годзе разам з часцямі Савецкай Арміі вызваляў наш родны горад ад фашысцкіх акупантаў. Гэта дэкан эканамічнага факультэта, прафесар У. Д. Арэшчанка, памочнік праректара па АГР, палкоўнік запасу М. П. Шкарбун, супрацоўнік факультэта фізічнага выхавання М. Я. Карабанаў. Яны і сталі ганаровымі гасцямі ўрачыстага вечара, прысвечанага слаўнай даце, які адбыўся ў актавай зале ГДУ. Кветкамі віталі ветэранаў студэнты.

Фота А. Карніенкі.

ЖЫВАЯ ПАМЯЦЬ

Дастойную сустрэчу 40-годдзю вызвалення Гомеля ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў падрыхтавалі студэнты матфака. На факультэце прайшлі вечары, канферэнцыі, сустрэчы з ветэранамі Вялікай Айчыннай вайны.

Камсамольцы групы М-31 сумесна са студэнтамі першага курса правялі вечар-сустрэчу «Мужнасці вечны агонь». На ім выступіў удзельнік вызвалення Гомеля, падпалкоўнік у адстаўцы А. А. Баскакаў. Студэнты А. Аўраменка, Л. Сакальчук, А. Быкоўская расказалі аб героях-гамяльчанах Ц. Барадзіне, Б. Царыкаве, братах Лізюковых.

У групах М-21, М-22 прайшла канферэнцыя «Жывая памяць пакаленняў», падрыхтаваная загадчыцай сектара ідэйна-выхаваўчай работы бібліятэкі універсітэта Н. Капшай, студэнтамі групы, кураторам С. І. Буракоўскай.

З дакладам аб дзейнасці гомельскіх і жлобінскіх падпольшчыкаў выступілі студэнткі Т. Тапарова, Т. Пятух, Я. Райская. Цікавым, хвалюючым быў расказ аб падпольшчыку Р. І. Цімафеенку яго жонкі Алены Сяргееўны.

Канферэнцыю завяршылі вершы М. Джаліля, А. Маркава, М. Агашынай у выкананні студэнтак А. Барабанавай, В. Новікавай, А. Усцілоўскай.

Р. БАЙКАЧОВА,
студэнтка групы М-21 матфака.

РУКАМІ ЭНТУЗІЯСТАЎ

Гасцінна расчыніла дзверы студэнцкае кафэ універсітэта. Ганаровае права адкрыць яго прадставілі камсамольцам лепшай у ГДУ акадэмічнай групы Г-41 гісторыка-філалагічнага факультэта. І, канешне тым студэнтам, якія сваімі рукамі афармлялі кафэ.

Гэта яны, сапраўдныя энтузіясты, разам з дацэнтам кафедры фізіялогіі спорту і спартыўнай медыцыны Ірынай Васільеўнай Хадалевіч ператваралі мару ў рэальнасць. Пасля заняткаў і ў час студэнцкіх канікулаў ішла работа ў былой дыетычнай зале сталовай універсітэта. З разнастайнымі будаўнічымі спецыяльнасцямі добра спраўляліся студэнты фізічнага факультэта Мікалай Зімін, Анатоль Глухаў, Аляксандр Серыкаў, Павел Страіцелеў і інш. Таццяна Казлова, студэнтка эканомфака, узяла на сябе абавязкі мастака-афарміцеля. Самі рабяты, валодаючы добрым мастацкім густам, разам з І. В. Хадалевіч распрацавалі эскіз будучага кафэ, які быў зацверджаны ў парткоме і рэктараце універсітэта.

Якое моцнае жаданне давесці пачатую справу да канца, аформіць кафэ да вызначанага тэрміну было ва ўсіх рабят! Даводзілася пераадольваць і нямала цяжкасцей: самім даставаць неабходныя для работы матэрыялы — метал, шкло, фарбы, драўніну. І дзякуючы сапраўднаму энтузіязму студэнтаў, аптымізму іх кіраўніка і добрага дарадчыка І. В. Хадалевіч новая культурная кропка ва універсітэце была адкрыта.

...Прыгожая зала, у якой пасучаснаму аформлен інтэр'ер, з люстрамі і вітражом, эстрадай для дыскатэкі. Такім сустрэла першых сваіх наведвальнікаў—гасцей студэнцкае кафэ ў пятніцу на мінулым тыдні. Сюды былі запрошаны на святочны «агеньчык», прысвечаны 40-годдзю вызвалення г. Гомеля, ганаровыя госці — ветэраны Вялікай Айчыннай вайны: дацэнт кафедры гісторыі СССР і ўсеагульнай гісторыі Г. С. Еўдакіменка, загадчык кафедры беларускай мовы, прафесар У. В. Анічэнка, дацэнт кафедры гісторыі КПСС Я. А. Семянчук, памочнік праректара па АГР, палкоўнік запасу М. П. Шкарбун, настаўніца адной са школ г. Гомеля, былая выпускніца педінстытута імя В. П. Чкалава Л. Ц. Дзяйкун. На адкрыццё кафэ прыйшлі таксама дэкан гістфіла Т. І. Язэпава, дацэнты А. К. Няронская, Т. П. Гараніна, Л. М. Гаранін, А. В. Саннікава, прадстаўнікі камітэта камсамола, грамадскіх арганізацый універсітэта.

Гаспадары і першаадкрывальнікі кафэ цёпла сустрэлі гасцей, ветэранаў віталі кветкамі і сувенірамі. З асаблівай пранікнёнасцю гучалі ў адрас ветэранаў словы вядучай вечара, студэнткі групы Г-41 Алены Варонінай. Потым яны падзяліліся сваімі ўспамінамі аб вайне. Горкімі і цяжкімі былі гэтыя ўспаміны: нялёгка было нагадваць аб стратах баявых сяброў, родных і блізкіх. Тады, у далёкім 41-м, яны, як і сённяшняя моладзь, былі летуценнікамі. Але вайна адабрала ў іх юнацтва, перакрэсліла светлыя мары. Яна апранула ў салдацкія шынялі Г. С. Еўдакіменку і М. П. Шкарбуна, зрабіла народным мсціўцам-падпольшчыкам Я. А. Семенчука, закінула ў далёкія Арліцкія горы Чэхаславакіі У. В. Анічэнку, ператварыла ўчарашнюю школьніцу Л. Ц. Дзяйкун у міласэрдную сястру. З хваляваннем і вялікай ўдзячнасцю слухалі студэнты расказы гэтых пасівелых ужо людзей, хто заваяваў ім права на сённяшняе шчаслівае жыццё. Яны ў сваю чаргу адчувалі, якая і на іх цяпер ускладзена адказнасць — усімі сіламі адстойваць мір на зямлі, не дапусціць развязвання новай вайны.

Цёплая і шчырая атмасфера панавала ў той вечар. Гучалі песні ваенных гадоў, жарты, смех, праводзіліся вясёлыя конкурсы. І ветэраны побач са студэнтамі адчулі сябе зноў маладымі і сэрцам, і душой.

...Студэнцкае кафэ стваралася з мэтай арганізацыі ва універсітэце цікавага, змястоўнага адпачынку моладзі. Яно павінна стаць месцам сустрэч з людзьмі, зносіны з якімі будуць узбагачаць моладзь духоўна, вучыць яе ўсяму лепшаму. Першая такая сустрэча адбылася!

Антуан дэ Сент-Экзюперы пісаў: «Самая большая роскошь на земле — это роскошь человеческого общения». Дык няхай гэта раскоша вызначыць усю далейшую дзейнасць і напрамак работы новага студэнцкага кафэ.

Ёсць яшчэ ў кафэ і шмат нявырашаных праблем: неабходна набыць музычную апаратуру і, на першы погляд, такія празаічныя, але неабходныя рэчы, як пасуда, сурвэткі і інш. Неабходна дапамагчы набыць савету кафэ ўсё гэта ў бліжэйшыя тэрміны.

Жадаючых трапіць ва ўтульнае і прыгожае кафэ будзе, зразумела, нямала. Але, у першую чаргу, сюды змогуць атрымаць запрашэнне лепшыя: акамічныя групы, студэнцкія будаўнічыя атрады, тыя, хто заслужыць гэта права добрымі справамі, паспяховай вучобай.

...Наваселле адбылося. У добры шлях, студэнцкае кафэ!

Т. ДУБЯК.

Савет кафэ, камітэт камсамола і прафком студэнтаў аб'яўляюць конкурс на лепшую назву кафэ. Пераможцу чакае прыз. З прапановамі звяртацца ў камітэт ЛКСМБ ГДУ.

РАСКАЗ КРАНУЎ ЗА СЭРЦЫ

Напярэдадні 40-годдзя вызвалення Гомеля ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў на нашым факультэце адбылася сустрэча з ветэранам Вялікай Айчыннай вайны, жыхаркай горада над Сожам Л. Ц. Дзяйкун. Яе прадставіла нам дацэнт кафедры рускай літаратуры А. К. Няронская.

Да вайны Ларыса Ціханаўна марыла стаць настаўніцай, таму што любіла дзяцей, хацела бачыць іх добрымі, сумленнымі, сапраўднымі савецкімі людзьмі. Такімі, якімі былі яе аднакласнікі, таварышы па вучобе. Яны таксама марылі. Марылі стаць інжынерамі, урачамі, музыкантамі...

Мары абарваліся на світанні 22 чэрвеня 1941 года.

Юнакоў, аднакласнікаў Ларысы Ціханаўны, з-за ўзросту ў армію не ўзялі. Праз некаторы час адны з іх сталі чырвонаармейцамі-добраахвотнікамі, другія — падпольшчыкамі, трэція — партызанамі.

Нам асабліва запамятаўся расказ Ларысы Ціханаўны пра братоў Пятра і Віктара Яроцкіх. Юныя падпольшчыкі, затым партызаны, бясстрашна змагаліся з ворагам, часта хадзілі ў разведку. Аднойчы, вяртаючыся з задання, браты даведаліся, што ў іх дома — засада. «А там жа —маці!» — мільганула ў іх думка. Хіба маглі сыны не паспрабаваць выратаваць яе? Нікому невядома, аб чым раіліся ў тую ноч браты. Але ў атрад вярнуўся толькі Пётр. Віктар пайшоў да хаты, каб ўвесці ў лес і маці. Гэта, на жаль, яму не ўдалося. І Віктар і маці трапілі ў рукі ворагаў. Допыт вялі доўга і жорстка: спачатку сына ў прысутнасці маці і наадварот. Ворагі нічога не дапыталіся ў Яроцкіх. Адзіныя словы, якія шаптаў Віктар у час катаванняў: «Мама, даруй»... Ад іх ёй лягчэй было пераносіць свае мукі.

За маці і брата бязлітасна помсціў ворагу Пётр. У адным з баёў, калі ў яго скончыліся патроны, ён з аўтаматам у руках кінуўся на ворага і ў рукапашнай забіў некалькі фашыстаў. У тым жа баі юнак загінуў і сам.

Не менш слаўны баявы шлях і іншых аднакласнікаў Ларысы Ціханаўны. Іх маладыя жыцці, поўныя сіл, энергіі, абарваліся на палях бітваў, на вузкіх партызанскіх сцежках, у фашысцкіх засценках.

Затаіўшы дыханне, слухалі мы расказ Ларысы Ціханаўны пра яе асабісты ваенны шлях. У 16 гадоў яна стала працаваць у шпіталі. Шмат жудасцей давялося перажыць дзяўчыне. Па некалькі сутак працавала без сну і адпачынку. У Ларысы Ціханаўны хапала мужнасці і цярпення, каб дапамагчы кожнаму параненаму воіну, таму, хто меў патрэбу ў яе дапамозе.

Адыходзячы на фронт, адзін з аднакласнікаў Ларысы Ціханаўны папрасіў яе: «Будзеш настаўніцай, раскажы рабятам пра нас». І яна выконвае гэту просьбу. Ужо ў пасляваенны час Ларыса Ціханаўна атрымала педагагічную адукацыю ў нашай ВНУ, тады яшчэ педінстытуце імя В. П. Чкалава. Часта расказвае яна вучням пра сваіх юных, слаўных аднагодкаў, мары якіх не збыліся, чыё жыццё абарвала вайна.

Пасля сустрэчы з Л. Ц. Дзяйкун мы з цікавасцю праглядзелі некалькі частак фільма «У вайны — не жаночы твар...».

У той жа дзень на гісторыка - філалагічным факультэце адбыліся сустрэчы студэнтаў з ветэранамі Вялікай Айчыннай вайны, супрацоўнікамі універсітэта А. А. Баскакавым, Р. С. Мільчанкам, пісьменнікамі П. Прыходзькам і Т. Бондар, прысвечаныя 40-годдзю вызвалення нашага роднага Гомеля ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Іх арганізатарам і ўдзельнікам была і дэкан гісторыка-філалагічнага факультэта Т. І. Язэпава.

Н. ШУМСКАЯ,
студэнтка гр. Р-11 гістфіла.

Навука ў рабочым страі

У ВЫЙГРЫШЫ—АБОДВА

НЯМА ўзнагароды вышэй, чым людская ўдзячнасць. З хваляваннем успрыняў прафесар нашага універсітэта Ф. М. Харытановіч вестку з калгаса імя XXII з'езда КПСС Гомельскага раёна. Паведамляючы аб ураджаі па 310 цэнтнерах бульбы з кожнага з 210 гектараў пасеваў, кіраўнікі гаспадаркі шчыра падзякавалі за дапамогу калектыву кафедры батанікі і фізіялогіі гаслін, якой кіруе Фёдар Мікалаевіч. Так акупілася садружнасць хлебаробаў з вучонымі.

Некалькі гадоў назад кафедра прапанавала свае паслугі калгасу. Гаворка ішла аб прымяненні стымулятараў ураджайнасці бульбы. Гэта рабілася за кошт перадпасяўной апрацоўкі клубняў бурштынавай кіслатой і мачавінай. Праўленне прыняло такую прапанову. Арашэнне клубняў, якім кіравала асістэнт кафедры Ніна Мікалаеўна Алімава, прыцягнула ў калгасе ўсеагульную ўвагу. Адны цікавіліся незвычайнай работай. Другія скептычна ўсміхаліся: маўляў, цуд здарыцца, калі ад жаўтаватых кропляў нейкай вадкасці лепшы бульбяны куст вырасце!.. Трэція, дасведчаныя ў каштоўнасці бурштыну, з'едліва пыталі: а ці не занадта дарагім акажацца клубень? Такім Ніна Мікалаеўна адказвала таксама жартам: кіслата ж не абавязкова выраблецца з сапраўднага бурштыну, яе можна атрымаць нават з гнілых яблыкаў.

Разрадзіў абстаноўку тады звеннявы-бульбавод І. М. Язэпенка: «Згодны на такую апрацоўку ўсяго насення на наш участак, а восень пакажа, хто будзе шчыра смяяцца, а хто — сумаваць».

І што ж? Іван Міхайлавіч накапаў увосень на 24 цэнтнеры клубняў з гектара больш, чым другое звяно на сумежным участку. Так навінка прабіла сабе дарогу на калгаснае поле. За лічаныя гады бульбаводы дасканала асвоілі перадпасяўную апрацоўку насення, сёлета ўсё яно ўжо апрацавана. А ў выніку — вышэйшы ўраджай у вобласці.

Гэта — толькі адзін прыклад з дзейнасці адной кафедры універсітэта. Прыняцце Харчовай праграмы актывізавала работу нашых батанікаў. Яны выпрацавалі рэкамендацыі па павышэнню эфектыўнасці заліўных лугоў, удасканалілі метады барацьбы са шкоднікамі раслін на польдэрах і асушаных землях, укараненне якіх павышае ўраджайнасць.

Падрыхтоўку высокакваліфікаваных кадраў і ўмацаванне сувязі з вытворчасцю ва універсітэце разглядаюць як двухзначную задачу. Упор у дзейнасці даследчыкаў робіцца на распрацоўку і выкананне мэтавых комплексных праграм. Іх цяпер больш за дваццаць. Мы вядзём сумесныя даследаванні з шэрагам вытворчых аб'яднанняў і прадпрыемстваў Го-

Студэнцкія канферэнцыі

ВЫСОКАЯ АЦЭНКА ДАСЛЕДАВАННЯЎ

У Іванава-Франкоўскім інстытуце нафты і газу (ІФІНГ) адбылася Міжрэспубліканская студэнцкая навуковая канферэнцыя «Геахімічныя метады пошукаў нафтавых і газавых месцанараджэнняў».

Сярод удзельнікаў былі студэнты МДУ, ГДУ, Саратаўскага, Іркуцкага і Омскага дзяржуніверсітэтаў, Пермскага, Томскага і Ташкенцкага політэхнічных інстытутаў, Цюменскага і Ухцінскага індустрыяльных інстытутаў, Азербайджанскага інстытута нафты і хіміі, Грозненскага нафтавага інстытута і інш.

Пасля пленарнага пасяджэння працавалі секцыі: «Газагеахімічных і біягеахімічных даследаванняў», «Бітуміналагічных, гідрагеахімічных і літалагічных даследаванняў».

У перыяд канферэнцыі яе ўдзельнікі азнаёміліся з работай «Комплекснай студэнцкай навукова-даследчай лабараторыі па праблемах нафтагазапошукавай геахіміі» кафедры геалогіі і разведкі нафтавых і газавых месцанараджэнняў ІФІНГа, наведалі музеі г. Івана-Франкоўска, прадпрыемствы нафтавай і газавай прамысловасці, свідравіны звышглыбокага бурэння, унікальныя геалагічныя аб'екты і музей Партызанскай Славы ў г. Ярэмча.

Гомельскі дзяржуніверсітэт прадстаўлялі студэнты 4-га курса геалагічнага факультэта В. Захарава і Ю. Няроўны.

Першай выступала В. Захарава з дакладам «Ацэнка перспектыў нафтагазаноснасці па гідрахімічных даных (на прыкладзе Прыпяцкага прагібу)».

На секцыі бітуміналагічных, гідрагеалагічных і літагеалагічных даследаванняў цікавы даклад зрабіў другі прадстаўнік ГДУ — Ю. Няроўны. Тэма яго даклада: «Гідрагеахімічныя асаблівасці міжсалявога комплексу Прыпяцкага прагібу» (навуковы кіраўнік асістэнт Ю. П. Іваноў).

Усяго было зроблена 36 дакладаў, якія адлюстроўваюць навуковую работу студэнтаў розных ВНУ краіны.

Прадстаўнікі ГДУ былі ўзнагароджаны граматамі і памятнымі падарункамі. У ліку іншых студэнтаў яны атрымалі запрашэнне прадставіць вынікі сваіх далейшых даследаванняў на чарговую міжрэспубліканскую студэнцкую навуковую канферэнцыю, якая адбудзецца праз 2 гады, але ўжо ў якасці маладых спецыялістаў.

Хочацца пажадаць усім студэнтам, якія займаюцца НДР, поспехаў у іх нялёгкай, але цікавай рабоце.

Ж. ГЕРАСІМАВА,
навуковы кіраўнік ГНДЛ факультэта.

Гэты здымак быў зроблены на рэспубліканскім навукова-метадычным семінары прарэктараў ВНУ па вучэбнай рабоце, на якім абмеркавана пытанне па павышэнню эфектыўнасці пазнавальнай дзейнасці студэнтаў у працэсе навучання.
У прысутнасці гасцей спецкурс для будучых фізікаў вядзе рэктар ГДУ акадэмік АН БССР Б. В. Бокуць.
Фота А. Карніенкі.

Успаміны аб працоўным леце

ВЫТРЫМАЛІ З ГОНАРАМ

Калі нам прапанавалі папрацаваць летам праваднікамі пасажырскіх паяздоў, згадзіліся мы не адразу: справа была для нас новай, а работа з людзьмі заўсёды адказная. Але ўсё ж мы рашылі паспрабаваць свае сілы, таму што наша будучая прафесія таксама заснавана на чалавечых зносінах.

Пасля заняткаў з кіруючымі работнікамі Гомельскага чыгуначнага рэзерва і паспяховай здачы экзаменаў мы былі дастаткова тэарэтычна падрыхтаваны. Аднак пачынаць работу было нялёгка: практычнага вопыту нам вельмі не хапала.

Пераканаліся мы ў гэтым ужо ў першым пробным рэйсе Гомель — Калінінград. Авалодаць маленькімі сакрэтамі складанай прафесіі праваднікам нам вельмі дапамаглі настаўнікі — вопытныя праваднікі з немалым стажам работы.

Але ўсё роўна, калі наш будатрад «Світанак» (камандзір Т. Шаўцова, камісар Г. Цесліна), сфарміраваны на базе трэцяга курса гісторыка-філалагічнага факультэта, адпраўляўся ў першы самастойны рэйс, мы вельмі хваляваліся.

Неўзабаве маршрут Гомель — Ленінград — Гомель № 561—562 стаў для нас сваім, знаёмым да самай маленькай станцыі. Работа аказалася цікавай: нам хапала не толькі рамантыкі, але і нечаканасцей. Галоўнай цяжкасцю аказалася не столькі фізічная праца, колькі здольнасць знайсці падыход да людзей.

Пасажыры аказваліся людзьмі з самымі рознымі патрабаваннямі, інтарэсамі і адносінамі да нашых намаганняў ствараць ім максімальныя зручнасці ў дарозе.

Шмат узнікала непрадбачаных сітуацый. Напрыклад, у агульным вагоне пасажыры прэтэндавалі на гарачы чай і пасцельную бялізну. Патрабаванні і просьбы да праваднікоў былі самымі разнастайнымі і нават нечаканымі. Нас выпрабоўвалі на дасціпнасць і на эрудыцыю, і мы ўсё гэта з гонарам вытрымалі.

Хаця здараліся і канфлікты, у цэлым мы ўдзячны нашым пасажырам за вышэйшую каштоўнасць для чалавека — зносіны, іх добразычлівасць і добрыя водгукі аб нашай рабоце. Ад іх мы многаму навучыліся, і, галоўнае, паверылі ў свае сілы.

Доўга мы будзем памятаць насычаныя падзеямі і ўражаннямі самыя лепшыя летнія месяцы.

Н. БАРЫНАВА,
Т. ГРЫБАВА,
слухачкі аддзялення журналістыкі факультэта грамадскіх прафесій.

Тэхнічныя сродкі — у вучэбны працэс

У ДАПАМОГУ ВЫКЛАДЧЫКУ

У сучасных умовах навукова-тэхнічнага прагрэсу паток інфармацыі ў кожнай галіне ведаў значна ўзрастае. ВНУ павінны рыхтаваць высокакваліфікаваных спецыялістаў, здольных засвойваць і выкарыстоўваць гэту інфармацыю на практыцы. Таму ў цяперашні час у вышэйшых навучальных установах удасканальваецца арганізацыя вучэбнага працэсу з улікам выкарыстання тэхнічных сродкаў навучання, накіраваных на павышэнне актыўнасці студэнтаў у вучэбным працэсе і эфектыўнасці засваення вывучаемага матэрыялу.

Правядзенне практычных заняткаў па заалогіі беспазваночных, вялікаму практыкуму, паразіталогіі з выкарыстаннем такіх тэхнічных сродкаў, як дыяпраектар, мікраскоп, кампрэсорый, мікратом значна павышае зацікаўленасць студэнтаў да дысцыпліны. Студэнты прывыкаюць да работы з тэхнічнымі сродкамі і самастойнай рабоце па прыгатаванню патрабуемых прэпаратаў. Тэхнічныя сродкі даюць магчымасць адначасова ўсёй групе засвоіць вывучаемы матэрыял, а праграмаванае прыстасаванне дазваляе ажыццяўляць аб'ектыўны кантроль, самакантроль і значна скарачае час на штодзённае апытанне студэнтаў.

Пры чытанні лекцый па ахове навакольнага асяроддзя на матфаку і на факультэце фізвыхавання, дзе студэнты менш падрыхтаваны па пытаннях біялогіі, выкладчык выкарыстоўвае слайды і кінафільмы. Пры дэманстрацыі апошніх ўся аўдыторыя наглядна ўспрыймае працэсы, якія адбываюцца ў прыродзе. Растлумачыць жа іх даходліва і зразумела толькі словамі надзвычай цяжка.

Вялікае ўражанне пакінулі ў студэнтаў фільмы «Бітва за ваду», «Зямля толькі адна», «Кола жыцця» і інш. Пасля прагляду гэтых фільмаў у студэнтаў узнікла шмат пытанняў. Пры чытанні лекцый па ахове прыроды з дэманстрацыяй кінафільмаў у студэнтаў з'яўляецца зацікаўленасць не толькі да прадмета, але і выхоўваюцца гуманныя адносіны да ўсяго жывога, любоў да роднай прыроды, ашчадныя адносіны да раслін і жывёл, асабліва да тых, якім пагражае небяспека поўнага знішчэння.

Выкарыстанне сучасных тэхнічных сродкаў на занятках па біялагічных дысцыплінах дазваляе больш кваліфікавана рыхтаваць спецыялістаў і эфектыўна выкарыстоўваць адведзены на заняткі час.

В. ТАЛКАЧОЎ,
кандыдат біялагічных навук.

БАКІ

меля. У апошнія гады толькі на прадпрыемствах Гомеля і вобласці ўкаранёна больш чым 60 навукова-тэхнічных распрацовак, якія выканалі вучоныя універсітэта. Эканамічны эфект, атрыманы ад асваення распрацовак у практыцы, у адзінаццатай пяцігодцы дасягнуў ужо амаль 5 мільёнаў рублёў.

Добрых поспехаў дабіліся тут калектывы кафедраў оптыкі, радыёфізікі. Усё большае значэнне набываюць вынікі творчага пошуку супрацоўнікаў праблемнай навукова-даследчай лабараторыі фізіка-хімічных працэсаў трэння, якая распрацоўвае метады павышэння зносаўстойлівасці дэталей машын і абсталявання. Работы вядуцца па заданню Дзяржаўнага камітэта СССР па навуцы і тэхніцы. Аўтаматызаваны стэнд для выпрабавання адноўленых вузлоў трэння аўтамабіляў, трактараў і іншых сельскагаспадарчых машын сёлета перадаецца Усесаюзнаму навукова-вытворчаму аб'яднанню «Рамдэталь». Для таго, каб прадухіліць знос і аднавіць дэталі машын, у праблемнай лабараторыі распрацоўваюцца металаплакіруючыя саставы. Яны зніжаюць каэфіцыент трэння ў 1,5—3 разы і скарачаюць вагавы знос у 10 і больш разоў. Камісія Прэзідыума Савета Міністраў БССР па пытаннях навукова-тэхнічнага прагрэсу рэкамендавала вытворчаму аб'яднанню «Мінскі трактарны завод імя У. І. Леніна» правесці доследна-прамысловую праверку металаплакіруючых змазак у вузлах трэння. Мяркуецца прымяніць іх у серыйнай вытворчасці.

Важныя для народнай гаспадаркі даследаванні вядуць матэматыкі універсітэта. Трэба адзначыць, напрыклад, удзел ГДУ ў выкананні саюзнай мэтавай праграмы ў галіне капітальнага будаўніцтва. Група вучоных пад кіраўніцтвам дацэнта В. Е. Быхаўцава распрацоўвае асноўныя прынцыпы разліку асноў фундаментаў. Новая методыка разліку атрымала папярэдняе адабрэнне. Яе ўкараненне ў вытворчасць дасць значны эканамічны эфект, істотна скароціць затраты на фундаменты (працаёмкасць — да 25 працэнтаў, матэрыялаёмкасць — на 10 працэнтаў).

За арганізацыю калектыўнага выкарыстання вылічальнай тэхнікі і распрацоўку сродкаў кіравання вылічальнымі працэсамі калектыў ГДУ ўзнагароджан дыпломам Дзяржкамітэта СССР па навуцы і тэхніцы і ВЦСПС.

Трывалыя дзелавыя сувязі з прамысловымі аб'яднаннямі і прадпрыемствамі ўстанавілі і развіваюць эканамічныя кафедры універсітэта. Асаблівая ўвага ўдзяляецца ўдасканаленню калектыўных форм арганізацыі і стымулявання працы. Укаранёная на Гомельскім заводзе пускавых рухавікоў методыка пераходу да прагрэсіўнай брыгаднай формы арганізацыі і аплаты працы дала добрыя вынікі. Даследаванні паказваюць, што штогадовы прырост прадукцыйнасці працы ад укаранення брыгад на прадпрыемствах Гомельскай вобласці складае ад 2 да 15 працэнтаў. Рэзервы росту прадукцыйнасці асобных брыгад — ад 7 да 60 працэнтаў. Арганізацыя комплексных зменных брыгад у рамонтных базах Гомельскага завода пускавых рухавікоў дазволіла скараціць цякучасць кадраў з 30—40 да 3—5 працэнтаў.

Выйгрыш ад асваення распрацовак кафедры эканомікі працы па Гомельскаму заводу пускавых рухавікоў склаў толькі за два гады 160 тысяч рублёў. Яе прапановы знайшлі прымяненне яшчэ на 27 прадпрыемствах Гомеля і вобласці.

Аднак павышэнне эфектыўнасці навукі — яшчэ вялікая праблема для нас. Універсітэт імкнецца вырашыць яе, умацоўваючы сувязі з галіновымі міністэрствамі, іх навукова-даследчымі інстытутамі, з АН БССР і АН СССР. Найбольшы вынік дае ўдзел у мэтавых комплексных праграмах. Аднак уключэнне ў такія праграмы для кафедраў і лабараторый універсітэта часта застаецца праблематычным. Неабходна ліквідаваць перашкоды, патрэбна цэнтралізаваць уключэнне вучоных ВНУ, кафедраў, лабараторый у вырашэнне важных навукова-тэхнічных праблем.

Найбольш слабае месца ў арганізацыі навукі ВНУ — укараненне яе вынікаў у вытворчасць. Ва універсітэце няма сваёй дастаткова магутнай доследна-канструктарскай, эксперыментальнай базы. А гэта сур'ёзна перашкаджае перадаваць вытворчасці гатовыя да ўкаранення навуковыя распрацоўкі. Часам універсітэт уласнымі сіламі не ў стане забяспечыць доследна-канструктарскія работы. У сувязі з гэтым яны, як правіла, павінны выконвацца на базе заказчыка. І тут узнікаюць цяжкасці, вырашэнне якіх нярэдка не залежыць ад калектыву вучоных універсітэта. Прыкладам гэтага могуць служыць навуковыя распрацоўкі, выкананыя такімі кафедрамі, як фізікі цвёрдага цела, оптыкі, фізіялогіі раслін і інш. Вучоныя нашага універсітэта з гарачым адабрэннем сустрэлі пастанову ЦК КПСС і Савета Міністраў СССР «Аб мерах па паскарэнню навукова-тэхнічнага прагрэсу ў народнай гаспадарцы», якая намеціла сістэму мер, накіраваных на карэннае паляпшэнне выкарыстання дасягненняў навукі.

М. НАВУЧЫЦЕЛЬ,
прарэктар па навуковай рабоце Гомельскага дзяржаўнага універсітэта, доктар эканамічных навук, прафесар, заслужаны работнік вышэйшай школы БССР.
(«Звязда», № 276, 1983 г.)

ДА ЎВАГІ КУРАТАРАЎ І ПАЛІТІНФАРМАТАРАЎ!

Паведамляецца прыкладная тэматыка палітычных інфармацый і гутарак сярод студэнтаў ў снежні 1983 г.

I. ПЫТАННІ ПАЛІТЫЧНАГА ЖЫЦЦЯ

1. У дружбе — наша сіла, крыніца новых дасягненняў у камуністычным будаўніцтве (Аб мацнеючай дружбе і супрацоўніцтве савецкіх народаў, іх узаемнай дапамозе ў развіцці эканомікі, навукі і культуры).

Матэрыял публікуе газета «Звязда».

2. Павялічваць уклад у рэалізацыю Энергетычнай праграмы. (Да Дня энергетыка — 22 снежня).

Матэрыял публікуе газета «Советская Белоруссия».

II. ПЫТАННІ ЭКАНАМІЧНАГА ЖЫЦЦЯ

3. Трэцяму году пяцігодкі — ударны фініш! (Аб імкненні працаўнікоў горада і вёскі памножыць творчыя намаганні на завяршальным этапе года, забяспечыць безумоўнае выкананне планавых заданняў і сацыялістычных абавязацельстваў па ўсіх паказчыках).

Матэрыял публікуюць усе газеты.

4. Твая заработная плата (У гутарцы раскрыць залежнасць росту заработнай платы і прэмій ад павелічэння асабістага працоўнага ўкладу кожнага работніка, канчатковых вынікаў работы калектыву і народнай гаспадаркі ў цэлым).

Матэрыял публікуе газета «Звязда», гл. таксама артыкул на гэту тэму ў часопісе «Агитатор» № 21 за 1983 г.

III. ПЫТАННІ КУЛЬТУРЫ І КАМУНІСТЫЧНАГА ВЫХАВАННЯ

5. Калектыў у тваім лёсе. (Аб адказнасці кожнага працаўніка за гонар свайго калектыву і калектыву за справы і ўчынкі кожнага работніка).

Матэрыял публікуе газета «Чырвоная змена».

6. Атмасфера сям'і. (Аб уплыве мікраклімату, узаемадносін у сям'і на фарміраванне ў дзяцей і падлеткаў высокіх маральных і грамадзянскіх якасцей).

Матэрыял публікуе газета «Знамя юности».

IV. ПЫТАННІ МІЖНАРОДНАГА ЖЫЦЦЯ І ПАЛІТЫЧНАГА ВЫКРЫЦЦЯ ІМПЕРЫЯЛІЗМУ

7. Шлях да сапраўднай бяспекі. (Аб канструктыўных мірных прапановах СССР, накіраваных на прадухіленне новага небяспечнага вітка гонкі ўзбраенняў, на захаванне міру на зямлі).

У аснову палітінфармацый і гутарак пакласці вывады і ацэнкі, якія змяшчаюцца ў артыкуле члена Палітбюро ЦК КПСС, міністра абароны СССР Маршала Савецкага Саюза Д. Ф. Усцінава, апублікаванага ў «Правде» 19 лістапада 1983 г.

8. Амерыканскі імперыялізм — вораг міру, прагрэсу і свабоды. (Аб праводзімай адміністрацыяй Рэйгана авантурыстычнай палітыцы гонкі ядзерных узбраенняў, канфрантацыі і агрэсіі).

Матэрыял публікуе газета «Звязда».

9. Капіталізм без прыкрас: асуджэнне на беспрацоўе. (Аб становішчы беспрацоўных у капіталістычных краінах).

Матэрыял апублікаван у часопісе «Международная жизнь» № 11 за 1983 г.

10. Сіянізм і антысемітызм — два бакі аднаго медаля. (Аб выкарыстанні міжнародным імперыялізмам ідэалогіі сіянізму і антысемітызму для распальвання шавінізму і расізму, для палітычнай дэзарыентацыі мас).

Матэрыял апублікаван у бюлетэні «Аргументы и факты» № 46 за 1983 г.

Пазнаёміла выстаўка

ВЕЛІЧ НАРОДНАГА ПОДЗВІГУ

Кожны месяц бібліятэка ГДУ арганізоўвае выстаўкі-прагляды новых кніг. Нядаўна была арганізавана чарговая выстаўка навінак літаратуры. На ёй экспанаваліся 384 экземпляры новых выданняў. Выстаўку наведала 317 чалавек. Тут была прадстаўлена літаратура па ўсіх галінах ведаў. Асобнае месца было адведзена літаратуры, прысвечанай Вялікай Айчыннай вайне і 40-годдзю вызвалення г. Гомеля ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў.

Цікавасць выклікала кніга «Вялікая Айчынная ў лістах». У кнігу ўвайшлі лісты аб Вялікай Айчыннай вайне, якія публікаваліся ў газеце «Правда» з 23 чэрвеня 1941 года па 1980 год уключна. Некаторыя з іх дадзены з невялікімі скарачэннямі, частка пісьмаў аднаўлена па арыгіналу. Здзіўляльна простыя, напісаныя сэрцам, яны ярка раскрываюць веліч подзвігу, здзейсненага нашым народам, яго любоў да маці-Айчыны, да Камуністычнай партыі, стойкасць і мужнасць, скромнасць і высакароднасць савецкага чалавека. «За цябе, Радзіма, за палі, лясы, лугі, за гарады і сёлы змагаўся я ў гады вайны, — пісаў радавы камуніст, кулямётчык В. Рабаў. — Побач са мной у акопе мой шаснаццацігадовы сын. Клянёмся біцца з фашысцкімі людаедамі да апошняй кроплі крыві, да апошняга ўздыху!» Пісьмы, дзённікі, лістоўкі ваенных гадоў, пасмяротныя запіскі, знойдзеныя ў гільзах, салдацкія трохвугольнікі са штэмпелямі палявой пошты, фатаграфіі, выразкі з газет... Якое ў іх багацце пачуццяў і думак! Сабраныя разам, яны ўзнаўляюць старонкі нядаўняга гераічнага мінулага, якое ўжо стала гісторыяй. Гісторыяй, якая не старэе ад часу і заўсёды застаецца жывой у памяці народнай. Гэта кніга адрасавана шырокаму колу чытачоў.

Увагу наведвальнікаў прыцягнула таксама кніга М. П. Хахлова «Іскра» радыруе: Запіскі чэкіста» (выдавецтва «Беларусь»). У гады Вялікай Айчыннай вайны ў Брэсцкай вобласці дзейнічала чэкісцкая група «Іскра». Яе ўзначальваў капітан дзяржаўнай бяспекі Міхаіл Пятровіч Хахлоў. Рашуча і дзёрзка праводзіўшы разведальныя і дыверсійныя аперацыі ў Брэсце і яго ваколіцах, «Іскра» аказала вялікую дапамогу камандаванню Чырвонай Арміі. У кнізе расказваецца аб баявой доблесці байцоў «Іскры» і партызан.

На выстаўцы было заказана каля ста экземпляраў кніг. Запрашаем выкладчыкаў, супрацоўнікаў і студэнтаў універсітэта рэгулярна наведваць выстаўкі новай літаратуры. Яны акажуць вялікую дапамогу ў навуковай і вучэбнай рабоце, пашыраць ваш кругагляд.

М. ГАПЕЕВА,
загадчыца аддзела бібліятэкі ГДУ.

Свет тваіх захапленняў

ДАРОГІ, ЯКІЯ МЫ ВЫБІРАЕМ

Сколько разных дорог пролегло по земле!
И как много людей неспокойных на свете!
Я о тех, кто рассветы встречает в седле,
Я о тех, обгоняющих солнце и ветер.

Хто не марыць аб бясконцых дарогах, якія вядуць за гарызонт? Хто не марыць пасядзець ля кастра, паслухаць турысцкія песні, удыхнуць водар палявых кветак і свежае паветра гор, велічных і задумлівых у сваёй дрымоце?

...Вечар. Ціха плёскаюцца ля берага хвалі. Патрэскваецца касцёр, яго чырвоныя іскры вырываюцца ў паветра, гучаць галасы і песні — сумныя і вясёлыя, лірычныя і жартоўныя. Здаецца, што знаходзімся ў нейкім прыгожым свеце чароўных гукаў і фарбаў, і недзе далёка засталіся тваё радасці і засмучэнні, будзённыя справы... А на ўсім свеце толькі ты і вечар, ты і твае сябры...

Гэты казачны свет авалодвае ўсёй тваёй душой і, аднойчы адчуўшы над сабой яго ўладарства, застаешся верным яму назаўсёды. Такія пачуцці былі ў студэнтаў фізічнага факультэта і ва ўсіх, хто прыйшоў у «Клуб сустрэч з цікавымі людзьмі» пры народным універсітэце маральна-эстэтычнага выхавання.

А пачыналася ўсё два гады назад, калі тры энтузіясты-студэнты фізічнага факультэта У. Самусеў, С. Каротчанка, А. Ільчанка сустрэлі свайго аднадумца, старэйшага навуковага супрацоўніка кафедры оптыкі Ул. Сыцько, чалавека, які аднойчы і назаўсёды аддаў сваё сэрца турызму.

Дарогі, дарогі... Сівыя Карпаты, сінявокая родная Беларусь, прывольны Енісей, Карэлія — край цудоўных азёраў і бурлівых рэчак, край гістарычных помнікаў... Менавіта там знаходзіцца цуда старажытнага драўлянага дойлідства — Кіжы, астравы з незвычайнымі назвамі.

А. Ільчанка, А. Русецкі, Ул. Самусеў з такім захапленнем расказвалі ўдзельнікам сустрэчы пра свае падарожжы, паказвалі слайды, фотаздымкі, кінафільмы, што немагчыма было не адчуць вялікай сілы ўздзеяння прыроды на чалавека. Тыя, хто прыйшоў на вечар, жылі іх жыццём, неспакойным, але таксама цікавым.

А якія цудоўныя песні праспяваў Юрый Гуменнікаў! Сапраўды, без песні ў паходзе не абысціся, і не дарма хлопцы жартавалі: гітарыст — самы паважаны чалавек у атрадзе. Юра асабліва, бо песні ў яго выкананні нельга слухаць абыякава: яны ідуць ад сэрца і надоўга застаюцца ў памяці.

За гады існавання турклуб дасягнуў значных поспехаў. Сёлета турысты ГДУ двойчы прымалі ўдзел у спаборніцтвах. Вясной занялі другое месца сярод мацнейшых каманд г. Гомеля, а нядаўна сталі пераможцамі абласных спаборніцтваў і заваявалі кубак аблсавета па турызму.

Ёсць у клуба і свае праблемы. У асноўным ён сфарміраваны са студэнтаў 5-га курса фізічнага факультэта. У 1984 годзе яны — ядро клуба — закончаць універсітэт.

Спадзяёмся, што і пасля іх уходу клуб, створаны энтузіястамі, будзе працягваць існаванне і згуртоўваць вакол сябе тых, хто марыць пра паходы, незабыўныя сустрэчы, сапраўдных сяброў.

Клуб запрашае да сябе ўсіх жадаючых. Калі ласка, прыходзьце! Наступнае пасяджэнне адбудзецца 7 снежня ў 19-30 ў пакоі клуба ў інтэрнаце № 1.

Л. ПЛЫГАЎКА,
старшыня калектыву слухачоў народнага універсітэта маральна-эстэтычнага выхавання інтэрната № 3.

На тэмы маралі

ПАКУЛЬ НЕ ПОЗНА

Вера людзей у чалавека, які аднойчы памыліўся ў жыцці, можа вярнуць яго на правільны жыццёвы шлях, дапамагчы зноў стаць сумленным. Верылі спачатку і былому вадзіцелю універсітэта П. Краўцову, спадзяваліся, што сам ён зможа зразумець агіднасць сваіх паводзін: парушэнне працоўнай дысцыпліны, не з'яўленне на работу без уважлівых прычын, п'янства ў рабочы час. Але П. Краўцоў не вельмі даражыў той верай у яго, і ўсё працягвалася, як і раней. А на заўвагі і папярэджванні ў свой адрас згодна ківаў галавой і даваў абяцанні: «Больш такое не будзе паўтарацца». Між тым, сваіх адносін да выканання службовых абавязкаў не мяняў. Так працягвалася да таго часу, пакуль аднойчы не наступіў сумны фінал. Кіруючы аўтамабілем у нецвярозым стане ў рабочы час, ён парушыў правілы дарожнага руху. Яго затрымалі работнікі ДАІ, даставілі ў выцвярэзнік. Вадзіцельскіх правоў П. Краўцова, канешне, пазбавілі, і яго персанальную справу разгледзеў таварыскі суд універсітэта.

Вось тут, здавалася б, настаў час, калі П. Краўцоў зразумее, нарэшце, свае памылкі. Але на таварыскім судзе ён не выглядаў разгубленым і вінаватым. Наадварот! Вёў сябе ўпэўнена, смела, нават нахабна. На крытычныя выступленні некаторых членаў суда адпускаў з'едлівыя рэплікі. І зусім ужо, як кажуць, акрыяў, калі пачалі гаварыць яго таварышы па рабоце вадзіцелі Г. Аўсянікаў, Г. Шуфер, прафорг С. Яўдохаў. Замест таго, каб асудзіць паводзіны П. Краўцова, яны стараліся неяк выгарадзіць, абараніць яго: маўляў, ён безадказны работнік, ніколі яго п'яным не бачылі і г. д. Што і казаць, «аб'ектыўна» ацанілі парушальніка працоўнай дысцыпліны. Можа хацелі запэўніць астатніх членаў таварыскага суда ў тым, што П. Краўцоў не заслугоўвае сур'ёзнага паракання?

Пасля абмеркавання прапаноў аб мерах яго пакарання, таварыскі суд пастанавіў аб'явіць П. Краўцову грамадскую вымову з апублікаваннем у шматтыражнай газеце «Гомельскі універсітэт». Ён таксама папярэджан аб тым, што пры паўторным паступленні матэрыялаў аб ім у таварыскі суд ГДУ аб злоўжыванні спіртнымі напіткамі, будзе ўзбуджана хадайніцтва аб яго прымусовым лячэнні.

П. Краўцова перавялі па пасаду слесара, на якой, па словах загадчыка гаспадаркі ГДУ У. Л. Антончанкі, ён працуе без заўваг, сумленна. Значыць, зразумеў, нарэшце, П. Краўцоў, што абраная ім раней сцежка ў жыцці да добра не прыводзіць? Толькі варта было б дайсці да гэтай ісціны намнога раней, а не пасля таварыскага суда, якога магло і не быць.

Т. НІКАЛАЕВА.

СПОРТ

СТРАЧАНЫЯ ПАЗІЦЫІ

У свой час валейбольная жаночая каманда нашага універсітэта была адной з мацнейшых у рэспубліцы. Цяпер сваёй гульнёй яна не радуе. Не выпадкова на спаборніцтвах, праведзеных абласным саветам «Буравеснік», прысвечаных 40-годдзю вызвалення Гомеля ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў, яе не аказалася нават сярод прызёраў. Пераможцамі турніра сталі валейбалісткі БІЧТу, другое месца занялі студэнткі Мазырскага педінстытута, трэцяе — Гомельскага кааператыўнага інстытута.

Сярод валейбалістаў мацнейшай аказалася таксама каманда студэнтаў-чыгуначнікаў, валейбалісты ГДУ — на другім месцы, мазыране — на трэцім.

МАЦНЕЙШЫЯ — ЛЁГКААТЛЕТЫ МАТФАКА

У напружанай барацьбе за камандную перамогу прайшоў лёгкаатлетычны крос, праведзены аблсаветам «Буравеснік» у гонар 40-годдзя вызвалення Гомеля ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Найбольшую колькасць ачкоў набралі спартсмены ГДУ, на другое месца выйшлі студэнты Гомельскага політэхнічнага інстытута, на трэцяе — БІЧТу. Адначасова праводзіўся залік і па факультэтах. Мацнейшымі аказаліся красмены матэматычнага факультэта, другое месца дасталося спартсменам факультэта фізвыхавання, трэцяе — электратэхнічнаму факультэту ГПІ.

(Наш кар.).

Рэдактар Ул. БАЛОГА

«Гомельский университет» — орган парткома, ректората, комитета ЛКСМБ и профкомов Гомельского государственного университета (на белорусском языке), Гомельская фабрыка «Палесдрук» Дзяржкамітэта БССР па справах выдавецтваў, паліграфіі і кніжнага гандлю. Гомель, Савецкая, 1. Аб'ём — 1 друк. аркуш. Тыраж 2000 экз.
Наш адрас: вул. Савецкая, 104, п. 3-11, т. 56-16-52.

АЗ 50727

Заказ 6248